ЗАЦВЯРДЖАЮ
Начальнік аддзела культуры Смаргонскага раённага выканаўчага камітэта
Т.М. Ражэва

# ІНСТРУКЦЫЯ
аб парадку арганізацыі і правядзенні раённага агляду-конкурсу па ўсіх відах і жанрах аматарскай мастацкай творчасці **«Распахнем акенца творчасці”**, прысвечанага Году якасці

1. Сапраўдная інструкцыя вызначае парадак арганізацыі і правядзення раённага агляду-конкурсу па ўсіх відах і жанрах аматарскай творчасці “Распахнем акенца творчасці” (далей – агляд-конкурс).
2. Асноўнымі мэтамі агляду-конкурсу з’яўляюцца: развіццё і папулярызацыя ўсіх відаў і жанраў аматарскай мастацкай творчасці ва ўстановах культуры раёна, арганізацыя вольнага часу розных груп насельніцтва, у тым ліку людзей сталага ўзросту, садзейнічанне гарманічнаму развіццю асобы, адраджэнне, захаванне і развіццё нацыянальнай духоўнай і культурнай спадчыны, самабытных традыцый беларускага народа, павышэнне мастацкага ўзроўню і выканальніцкага майстэрства ўдзельнікаў аматарскай мастацкай творчасці.
3. Арганізатарам агляду-конкурсу з’яўляюцца аддзел культуры Смаргонскага раённага выканаўчага камітэта і дзяржаўная ўстанова культуры “Смаргонскі раённы цэнтр культуры”.
4. У аглядзе-конкурсе прымаюць удзел структурныя падраздзяленні дзяржаўнай установы культуры “Смаргонскі раённы цэнтр культуры”: філіялы Дамоў культуры, сельскіх клубаў.
5. На агляд-конкурс прадстаўляецца цэласная тэматычная праграма, працягласцю да 40 хвілін, у якой павінны быць прадстаўлены ўсе жанравыя накірункі мастацтва, якія атрымалі развіццё ва ўстанове. Журы будзе асобна ацэньваць майстэрства вядучых, іх артыстычнасць, культуру прамовы, эмацыйнасць, здольнасць да імправізацыі.
6. Агляд-конкурс аматарскай мастацкай творчасці праводзіцца студзень-люты 2025 года (па асобнаму графіку).
7. Ацэнка тэматычных праграм, прадстаўленых на агляд-конкурс, будзе ажыццяўляцца па наступных намінацыях:
- лепшая тэматычная праграма;
- лепшая фальклорная праграма;
- харавое, вакальнае, сольнае выкананне;
- мастацкае чытанне;
- майстэрства вядучага;

- самадзейная тэатральная творчасць;
- музычнае і мастацкае афармленне праграмы;
- лепшая выстава народнай творчасці (персанальныя выставы).

8. Пераможцы агляду-конкурсу будуць ўзнагароджаны Дыпломамі і грашовымі сертыфікатамі. Журы пакідае за сабой права:
- прысуджаць у намінацыі месца;
- не вызначаць пераможцаў у пэўнай намінацыі;
- уводзіць дадатковыя намінацыі ў рамках тэматыкі агляду-конкурсу.

9. Лепшыя тэматычныя канцэртныя праграмы і індывідуальныя выканаўцы будуць запрошаны да ўдзелу ў раённых святочных мерапрыемствах.

10.Склад журы агляду-конкурсу:

| | |
|---|---|
| Ражэва Таццяна Мар'янаўна | – начальнік аддзела культуры Смаргонскага райвыканкама *(са згоды)* |
| Крацянок Галіна Іванаўна | – дырэктар дзяржаўнай установы культуры "Смаргонскі раённы цэнтр культуры" *(старшыня журы)* |
| Харко інна Паўлаўна | – кіраўнік народнай эстраднай студыі "Міраж" дзяржаўнай установы культуры "Смаргонскі раённы цэнтр культуры" |
| Юркевіч Наталля Васільеўна | – загадчык аддзела народнай творчасці і культурна-дасугавай дзейнасці дзяржаўнай установы культуры "Смаргонскі раённы цэнтр культуры" |
| Крывянкова Вольга Канстанцінаўна | – метадыст па рабоце з клубнымі фарміраваннямі дзяржаўнай установы культуры "Смаргонскі раённы цэнтр культуры" |